**А. П. Шукаловіч**

# ПСІХАЛАГІЗМ І ЯГО ВЫЯЎЛЕННЕ Ў АПАВЯДАННЯХ АНАТОЛЯ КУДРАЎЦА

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*alena-shukalovich@mail.ru;*
*навук. кір. – А. І. Бельскі, д-р філал. навук, праф.*

У артыкуле разглядаюцца прыёмы псіхалагізму ў апавяданнях Анатоля Кудраўца: унутраны маналог, партрэт, дзеянні, анейрычныя апісанні і інш. З іх дапамогай пісьменнік раскрывае ўнутраны свет персанажа з яго каштоўнасна-сэнсавай і жыццёва-філасофскай накіраванасцю.

***Ключавыя словы:*** Анатоль Кудравец; псіхалагізм у літаратуры; псіхалагічныя прыёмы; унутраны маналог; псіхалагічны партрэт персанажа; анейрычныя апісанні.

Амерыканскі псіхолаг і псіхіятр Э. Бёрн пісаў: «Псіхіятр – гэта доктар, які кансультуе і лечыць людзей, якія пакутуюць ад эмацыйных разладаў, якія зведваюць цяжкасці ў асабістых адносінах, якія шкодзяць самі сабе сваімі паводзінамі, а ў цяжкіх выпадках – перажываюць ненармальныя пачуцці, уяўленні і адчуванні. Вывучаючы матывы, якія рухаюць людзей, ён пытаецца ў сябе: "Што прымушае гэтага чалавека адчуваць, думаць так, як ён гэта робіць?"» [1, с. 19]. Пры стварэнні і абмалёўцы па-сапраўднаму жывых вобразаў-персанажаў пісьменнік, як даследчык псіхікі асобы, таксама кіруецца падобнымі пытаннямі. Праз эмацыйныя рэакцыі, жэсты, міміку, рухі, стан цела, думкі, знешні і ўнутраны маналог, маўленне і г. д. «будуе» той ці іншы цэласны вобраз, дзе кожная дэталь накіравана на раскрыццё сутнасці характару і паводзінаў персанажа. Псіхалагічная дэталізацыя дазваляе аўтару персаналізаваць свайго героя.

Паводле В. П. Рагойшы, «псіхалагізм у літаратуры – скрупулёзнае, яскравае выяўленне пісьменнікам унутранага, душэўнага стану вобраза-персанажа» [2, с. 202]. М. С. Рагачэўская пашырае азначэнне гэтага паняцця: «Псіхалагізм – аб’ектыўная, рознаўзроўневая, адкрытая і гістарычна рухомая катэгорыя, якая характарызуе глыбіню і спосаб адлюстравання свядомасці канкрэтнага характару, жанрава-стылёвае адзінства твора з перавагай у ім элементаў душэўнага зместу над элементамі свету рэчаў і падзейнасці, адлюстраванне тыпу свядомасці ў кантэксце той ці іншай канцэпцыі асобы, а таксама інтэнсіўны псіхалагічны ўплыў на чытача» [3, с. 33–34]. З гэтай трактоўкі можна вылучыць асноўныя задачы псіхалагізму – мастацкае выяўленне актаў псіхікі і свядомасці героя,

адлюстраванне яго ўнутранага свету, абмалёўка пэўнага псіхатыпу, свядомаснага складу літаратурнага персанажа, псіхалагічнае ўздзеянне на чытача.

У літаратурна-гістарычным кантэксце вылучаюцца два тыпы псіхалагізму – абстрактны і канкрэтна-гістарычны. Іх адрозненне ў тым, што абстрактны псіхалагізм заключаецца ў базавым, прыродным успрыманні псіхалогіі чалавека, у той час як успрыманне канкрэтна-гістарычнага тыпу псіхалагізму залежыць ад канкрэтнай літаратурнай эпохі ці пэўных гістарычных абставінаў, у якіх складваецца канцэпцыя асобы.

Формы выяўлення псіхалагізму ў літаратуры яшчэ не набылі дакладнай класіфікацыі. В. П. Рагойша адзначае: «Псіхалагізм звычайна праяўляецца ў трох формах: унутранай (пры дапамозе ўнутранай мовы персанажаў, вобразаў памяці і ўяўлення), знешняй (праз мастацкія дэталі, псіхалагічную інтэпрэтацыю паводзін і мовы персанажаў, іх міміку, жэсты), апісальна-аўтарскай (пераказ думак і пачуццяў персанажаў аўтарам)» [2, с. 202]. Тэарэтыкамі і даследчыкамі-літаратуразнаўцамі выпрацаваны шэраг тэрмінаў і паняццяў для вызначэння вербальных і экстралінгвістычных спосабаў мастацкага адлюстравання працэсаў свядомасці, псіхікі, пачуццяў, перажыванняў, працэсаў успрыняцця знешняй інфармацыі. Існуе некалькі спосабаў псіхалагічнага адлюстравання: апісанне ўражанняў героя ад навакольнага асяроддзя, вызначэнне яго пачуццяў, характарыстыка перажыванняў, унутраны маналог і інш. М. С. Рагачэўская пашырае класіфікацыю спосабаў адлюстравання псіхалагізму ў творы, што могуць быць выяўлены праз базавыя прыёмы псіхалагічнага адлюстравання стылістычнага ўзроўню: неаналітычныя прамыя (унутраны маналог, рэфлексія, «плынь свядомасці», няўласна-простая мова); неаналітычныя ўскосныя (знешняе маўленне, партрэт (у дынаміцы ці статыцы), дзеянні, дэталі прасторы, пейзаж, прыём замоўчвання, анейрычныя апісанні); аналітычныя (псіхалагічны аналіз ад асобы апавядальніка ці іншага персанажа, самааналіз героя ці інтраспекцыя).

Таксама трэба мець на ўвазе, што псіхалагізм у мастацкім творы выяўляецца не толькі праз раскрыццё псіхалагічнага стану персанажаў, але і праз сукупнасць усіх псіхічных працэсаў аўтара, героя і чытача. Абапіраючыся на гэтыя аспекты тэорыі, мы і разглядаем спосабы выяўлення псіхалагізму ў апавяданнях Анатоля Кудраўца. Для герояў яго апавяданняў характэрна ісці насустрач ілюзорнаму, лепшаму, светламу, добраму, чалавечаму шчасцю. Пісьменнік стварае свой мастацкі свет паводле законаў праўды, сумленнасці, чалавечнасці.

Яніна з апавядання «Сяструха» перажыла смерць бацькоў у пачатку вайны, гібель жаніха-партызана, замужжа і цяжкае жыццё з хворым на алкагалізм Іванкам, нараджэнне пяцярых дзяцей, у тым ліку дачкі-інваліда, якіх жанчына выхоўвае пасля смерці мужа. Яна сустракае асуджэнне

людзей, і нават блізкіх родзічаў у сувязі з тым, што ў яе жыцці з'явіўся каханы мужчына, да таго ж маладзейшы за яе. Нягледзячы на ўсе неспрыяльныя абставіны, Яніна не зрабілася зацятай, недаверлівай і абыякавай, а, наадварот, яна жыве і прагне спасцігаць радасці жыцця, шукае для сябе новыя яго сэнсы, разумее і не асуджае людзей, што навучыліся «гараваць, навучыліся шкадаваць, толькі не навучыліся радавацца» [4, с. 298]. У гэтым творы А. Кудравец па-майстэрску карыстаецца прыёмамі псіхалагізму. Праз партрэты герояў раскрываюцца іх глыбінныя ўнутраныя адчуванні: «Ён вярнуўся дамоў прыціхлы, памаладзелы, з белым, быццам выкачаным у муку тварам і глыбокім бычыным сумам у вачах» [4, с. 292], – піша аўтар пра Іванку, які вярнуўся пасля «лячэння алкаголю». Гэты «бычыны сум у вачах» нібы дае чытачу ўяўленне пра тое, якая жыццёвая драма разварочваецца ўнутры героя, які не можа ды, напэўна, і не разумее, навошта яму патрэбна пазбаўляцца ад залежнасці, якая прыносіць столькі задавальнення.

Сапраўдны паўнавартасны псіхалагічны партрэт Яніны будуе аўтар праз такую дэталь, як вочы. Яны «блішчэлі па-маладому задорліва і сумна» пры спатканні, у іх «Аркадзя спаймаў насцярожанасць», калі толькі ўвайшоў у хату Яніны, тая «выцерла вочы», калі расказвала пра сваё жыццё, і адводзіла іх, калі Аркадзя глядзеў ёй прама ў твар. Гэтыя вочы, а значыць і сама Яніна, не давяраюць, саромеюцца і асцерагаюцца людзей і іх асуджэння. Варта адзначыць, што Анатоль Кудравец неаднаразова акцэнтуе ўвагу на гендарных аспектах паводзінаў, жэстаў, мімікі, голасу сваіх персанажаў: «Яніна ўсхліпнула носам, заміргала, твар яе скрывіўся, але яна зараз жа ўзмахнула галавой.

– Ой, што гэта я. Баба, яй-богу, баба…» [4, с. 296].

Гераіня не дазваляе сабе плакаць і праяўляць эмоцыі на людзях, бо гэта характарызуе яе як «бабу», а ў кантэксце яе слоў засведчыць пра слабасць. З гэтага вынікае, што абставіны цяжкага жыцця прымусілі прыхоўваць праявы жаноцкасці, г. зн. слабасці, кволасці. Тым не менш, словы яе становяцца больш мяккімі і душэўнымі, калі Яніна кажа пра каханага мужчыну: «Але ж ён паважае мяне. І я ажыла пры ім, сагрэлася, адтала душой і целам…» [4, с. 298]. Гэта яскрава гаворыць пра адчуванне гераіні – стрыманасць і насцярожанасць у соцыуме і мяккасць пры чалавеку, які яе паважае і кахае.

Праз «нецярпліва-бабскі» голас характарызуе аўтар Рыгора Мельнічонка з апавядання «Вясёлыя людзі». Ён «плаксівы», калі Рыгор хоча, каб яго пашкадавалі, і «хітра-жвавы», які «перастаў плакацца», калі гаворка заходзіць пра запрашэнне ў госці з мэтай застолля. Праз гэтую дэталь аўтар «падсвечвае» псіхалагічны партрэт персанажа – чалавека, які жаліцца на ўсё ды ўсім тады, калі гэта яму карысна. Тут праява жаночай рысы ў характары героя выступае хітрым псіхалагічным прыёмам, які той выкарыстоўвае ў стасунках з людзьмі.

У творах А. Кудравец закранае пытанні ўзаемадзеяння чалавека ў соцыуме. У апавяданні «Дзень перад святам» унутраны свет Івана Ігнатавіча праз розныя прыёмы псіхалагізму выяўляецца як трывожны і незразумелы. Празаік выкарыстоўвае прыём псіхасімвалізму, ствараючы вобраз грушыдзічкі, якую пакінулі адну расці ў полі, у той час, як выразалі ўвесь сад. Іван Ігнатавіч застаўся адзін, як груша-дзічка, і гэтая адзінота падштурхоўвала да адчування таго, «як нешта шчырае, чалавечае адмірае ў яго душы, пакідаючы струпы. Яны не зажывалі, гэтыя струпы, балелі, нылі…» [4, с. 221]. Герой усё трымае пад кантролем, будуе дыстанцыю з падначаленымі, але прагне вызвалення з такіх абставін. Праз яшчэ адзін прыём псіхалагізму – адлюстраванне цялеснасці – аўтар паказвае прагу нават самога цела скінуць з сябе аковы сацыяльных рамак: «Старшыня не думаў пра тое, чаму гэта раптам ён ідзе за гэтым старым з прыгорбленымі плячыма. Яму сказалі, і ён ідзе. То заўсёды загадваў ён, і людзі рабілі тое, што ён загадваў, а гэта яму сказалі ісці ў хату, і ён ідзе…» [4, с. 226].

Удала выкарыстоўвае А. Кудравец і анейрычныя апісанні. Вельмі адмысловы сон бачыць Андрэй з апавядання «На зялёнай дарозе»: ён ідзе па зялёнай дарозе з каханай, якая яго пакінула, потым тая знікае, а на яе месцы з'яўляецца стары, якога ўсе называлі Братачка, дарога змяняе колер – робіцца шэрай. Потым Братачка ўзлятае, а на яго месцы застаюцца толькі дзве чырвоныя ступні, падобныя да інфузорый-туфелек, намаляваных у падручніку заалогіі для шостага класа. Гэтым сном заканчваецца апавяданне. Чытач нібы павінен сам дайсці да пэўных высноў.

Такім чынам, А. Кудравец па-майстэрску ўжывае разнастастайныя прыёмы псіхалагізму: унутраны маналог, партрэт, дзеянні, анейрычныя апісанні і інш. Ён умела карыстаецца мастацкімі дэталямі, якія ва ўяўленні чытача ствараюць тып ці мадэль паўнавартаснага характару персанажа. Гэта эмацыйна ўздзейнічае на чытача. У апавяданнях А. Кудраўца паказваецца ўнутранае жыццё чалавека: складанае, супярэчлівае, экзістэнцыйна драматычнае ці трагічнае.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Берн Э.* Введение в психиатрию и психоанализ для непосвященных. Москва : Эксмо, 2021.

2. *Рагойша В. П.* Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці. Мінск : Нар. асвета, 2009.

3. *Рогачевская М. С.* Новые формы психологизма в британском романе XX века: дис. … д-ра филол. наук: 10.01.03. 2018.

4. *Кудравец А.* Выбраныя творы: у 2 т. / прадм. С. Андраюка. Мінск : Маст. літ., 1987. Т. 1: Аповесць. Апавяданні.